Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па адукацыі
ў галіне культуры і мастацтваў

# ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ ХАРЭАГРАФІЧНАГА МАСТАЦТВА

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 02 01*
*Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках),*
*напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец);*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец);*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец);*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Ю. М. Чурко,* прафесар кафедры харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* майстэрства акцёра ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»;
*Т. Д. Арлова,* прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ТЫПАВОЙ:**
*кафедрай* харэаграфіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 11.02.2015);
*навукова-метадычным* саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 12.03.2015);
*навукова-метадычным* саветам па харэаграфіі і мастацтве эстрады вучэбна-метадычнага аб'яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 1 ад 13.04.2015)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Ю. М. Чурко

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» распрацавана для ўстаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках). Праграма прызначана для спецыяльнасці 1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках) (напрамкаў спецыяльнасці 1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец), 1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец), 1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец), 1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец).

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» прадугледжвае вывучэнне гістарычных этапаў развіцця і лепшых твораў сусветнай харэаграфіі і з'яўляецца важнай састаўной часткай працэсу навучання і выхавання будучых харэографаў.

Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» знаходзіцца ва ўзаемасувязі з вучэбнымі дысцыплінамі «Мастацтва балетмайстра», «Класічны танец» і «Народна-сцэнічны танец».

*Мэтай* дысцыпліны з'яўляецца знаёмства студэнтаў з комплексам інфармацыі па гісторыі харэаграфіі, узбраенне іх уменнем даследаваць і ацэньваць дзейнасць асобнага харэографа або мастацкага твора.

*Задачы* дысцыпліны:

– набыццё ведаў па гісторыі сусветнай харэаграфіі ў розныя эпохі;

– набыццё ведаў у галіне беларускага танцавальнага фальклору і нацыянальнага балетнага тэатра;

– набыццё ўменняў самастойна аналізаваць мастацкія вынікі творчасці харэографаў.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– гісторыю розных этапаў развіцця харэаграфічнага мастацтва;

– асноўныя эпохі, кірункі, стылі і нацыянальныя школы ў галіне харэаграфіі;

– заканамернасці гістарычнага развіцця сусветнага і айчыннага харэаграфічнага мастацтва;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– віды і жанры харэаграфічнага мастацтва;
– асаблівасці беларускай народнай танцавальнай творчасці;
– класіфікацыю ўзораў беларускага танцавальнага фальклору;
– асаблівасці станаўлення нацыянальнага балетнага мастацтва;
– асноўных прадстаўнікоў розных відаў сусветнага і айчыннага харэаграфічнага мастацтва і іх творчасць;
– сучасны стан і тэндэнцыі развіцця сусветнага і айчыннага харэаграфічнага мастацтва;

*умець:*

– выкарыстоўваць тэарэтычныя веды ў галіне харэаграфічнага мастацтва;
– аналізаваць творы харэаграфічнага мастацтва;
– ацэньваць дзейнасць прадстаўнікоў харэаграфічнага мастацтва;
– вызначаць тэндэнцыі развіцця харэаграфічнага мастацтва на сучасным этапе;
– прымяняць веды па гісторыі харэаграфічнага мастацтва для выкладчыцкай дзейнасці;

*валодаць:*

– методыкай аналізу твораў харэаграфічнага мастацтва;
– уменнямі выкарыстоўваць гістарычныя веды ў сучасным кантэксце.

Засваенне вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» павінна забяспечыць фарміраванне наступных груп кампетэнцый.

**Акадэмічныя кампетэнцыі:**

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

**Сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:**

САК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці.

САК-7. Быць здольным асэнсавана ўспрымаць і беражліва адносіцца да гістарычнай, культурнай спадчыны Беларусі і свету, культурных традыцый і рэлігійных поглядаў.

**Прафесійныя кампетэнцыі:**

**Выканальніцкая дзейнасць**

ПК-3. Працаваць з рознымі крыніцамі для стварэння рэпертуару, літаратурай па харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Пастановачная і рэпетыцыйная дзейнасць**

ПК-12. Ажыццяўляць аналіз сучаснага стану і перспектыў развіцця харэаграфічнага мастацтва.

**Педагагічная дзейнасць**

ПК-19. Аналізаваць фактары фарміравання і заканамернасці развіцця сучаснай пластычнай мовы, асаблівасці развіцця харэаграфічнага мастацтва, планаваць і арганізоўваць адукацыйны працэс, абапіраючыся на традыцыйныя і аўтарскія падыходы і мадэлі навучання, выхавання, сістэматычна павышаць узровень прафесійнай кваліфікацыі.

**Навукова-даследчая і метадычная дзейнасць**

ПК-27. Вывучаць, абагульняць практычны і тэарэтычны вопыт айчыннага і замежнага харэаграфічнага мастацтва.

Вялікае значэнне мае самастойная работа студэнтаў, якая прадугледжвае абавязковае знаёмства з асаблівасцямі арганізацыі дзейнасці лепшых мастацкіх калектываў Рэспублікі Беларусь, вывучэнне вопыту работы вядомых айчынных і замежных харэографаў – кіраўнікоў ансамбляў танца і рэпетытараў, як непасрэдна, так і выкарыстоўваючы розныя тэхнічныя сродкі.

Спецыфіцы харэаграфіі як віду мастацтва, яе эстэтычнай прыродзе і сацыяльным функцыям прысвечаны ўводзіны.

У першым раздзеле «Харэаграфічнае мастацтва замежных краін» разглядаюцца найбольш змястоўныя эпохі ў харэаграфічнай культуры заходнееўрапейскіх краін – ад старажытнасці да XX ст.

Другі раздзел «Руская харэаграфія» ўключае гісторыю рускага харэаграфічнага мастацтва ад вытокаў да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Вялікае месца адводзіцца тлумачэнню рыс нацыянальнай своеасаблівасці рускай харэаграфіі, эвалюцыі рэалістычных тэндэнцый у балетным тэатры.

Трэці раздзел «Савецкае і рускае харэаграфічнае мастацтва» прысвечаны асноўным этапам развіцця савецкага і рускага харэаграфічнага мастацтва. Тут разглядаюцца найбольш значныя работы балетмайстраў у савецкі перыяд, а з другой паловы 80-х гг. XX ст. – працы рускіх харэографаў.

У чацвёртым раздзеле «Беларуская харэаграфія» асвятляецца гісторыя беларускай харэаграфіі, аналізуюцца важнейшыя творы беларускіх аўтараў, своеасаблівасці балетнага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У кожным раздзеле даецца агульная характарыстыка гістарычных умоў, грамадскага і культурнага жыцця дадзенай эпохі, мастацкіх тэндэнцый, творчасці выдатных майстроў. Тэмы дысцыпліны размяшчаюцца па храналагічным прынцыпе, але гэта не выключае праблемнае, або дыялагічнае іх выкладанне ў лекцыйным цыкле. Заняткі суправаджаюцца праглядам відэа- і кінафільмаў па харэаграфіі, праслухоўваннем музыкі.

Метадалагічнай базай дысцыпліны з'яўляюцца тэарэтычныя палажэнні, распрацаваныя айчынным мастацтвазнаўствам і эстэтыкай, гістарычны, параўнальны, карпаратыўны, праблемна-модульны метады.

Сярод эфектыўных педагагічных прыёмаў, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі вопыту вырашэння задач у іх будучай дзейнасці, – метад рэйтынгавай ацэнкі, варыятыўныя, камунікатыўныя, праектныя і іншыя тэхналогіі.

Дысцыпліна ўключае значную частку самастойнай работы студэнтаў, якая прадугледжвае наведванне тэатраў, прагляд балетных спектакляў, канцэртных выступленняў прафесійных і аматарскіх танцавальных калектываў з мэтай паглыблення ў сферу харэаграфічнага мастацтва.

На вывучэнне дысцыпліны «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» ўсяго адведзена 230 гадзін, з якіх 142 – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных заняткаў – 120 гадзін лекцый, 22 гадзіны семінараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | лекцыі | семінарскія заняткі |
| **Уводзіны** | 4 | |
| **Раздзел I. Харэаграфічнае мастацтва замежных краін** | | |
| *Тэма 1.* Старажытныя формы танца | 4 | |
| *Тэма 2.* Харэаграфічная культура Старажытнай Грэцыі | 4 | |
| *Тэма 3.* Харэаграфічнае мастацтва Сярэдневякоўя і эпохі Адраджэння | 4 | |
| *Тэма 4.* Харэаграфічнае мастацтва класіцызму (XVII ст.) | 4 | |
| *Тэма 5.* Харэаграфічнае мастацтва эпохі Асветніцтва (XVIII ст.) | 4 | |
| *Тэма 6.* Харэаграфічнае мастацтва XIX ст. | 6 | |
| *Тэма 7.* Харэаграфія XX ст. | 6 | 2 |
| *Тэма 8.* Харэаграфія на рубяжы XX–XXI стст. Сучасны танец | 8 | 2 |
| **Раздзел II. Руская харэаграфія** | | |
| *Тэма 1.* Рускае харэаграфічнае мастацтва ад вытокаў да ўзнікнення балетнага тэатра | 2 | |
| *Тэма 2.* Пачатак харэаграфічнага тэатра ў Расіі (XVII – першая палова XVIII ст.) | 2 | |
| *Тэма 3.* Харэаграфічнае мастацтва другой паловы XVIII – пачатку XIX ст. | 2 | |
| *Тэма 4.* Харэаграфічнае мастацтва першай паловы XIX ст. | 4 | |
| *Тэма 5.* Харэаграфічнае мастацтва XIX ст. | 6 | |
| *Тэма 6.* Руская харэаграфія XX ст. | 6 | 2 |
| *Тэма 7.* Выканальніцкае мастацтва майстроў рускага балета XX ст. | 4 | 4 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| **Раздзел III. Савецкае і рускае харэаграфічнае мастацтва** | | |
| *Тэма 1.* Савецкі балетны тэатр першага дзесяцігоддзя XX ст. | 4 | |
| *Тэма 2.* Савецкі балетны тэатр 30-х гг. XX ст. | 4 | 2 |
| *Тэма 3.* Выканальніцкае майстэрства савецкіх артыстаў балета ў 30-я гг. XX ст. | 4 | |
| *Тэма 4.* Ансамбль танца – новы жанр харэаграфічнага мастацтва | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Нараджэнне і развіццё балетных тэатраў у нацыянальных рэспубліках | 2 | |
| *Тэма 6.* Савецкая харэаграфія 50–60-х гг. XX ст. | 4 | |
| *Тэма 7.* Харэаграфічнае мастацтва канца XX ст. | 4 | |
| *Тэма 8.* Харэаграфічнае мастацтва ў наш час | 4 | 2 |
| **Раздзел IV. Беларуская харэаграфія** | | |
| *Тэма 1.* Беларускае народнае танцавальнае мастацтва, асноўныя этапы яго развіцця | 2 | |
| *Тэма 2.* Харэаграфічнае мастацтва да XX ст. | 2 | |
| *Тэма 3.* Станаўленне беларускага балетнага тэатра і прафесійнай харэаграфіі | 2 | |
| *Тэма 4.* Балетныя творы беларускіх аўтараў на фальклорную, гістарычную і літаратурную тэматыку | 4 | 2 |
| *Тэма 5.* Спектаклі беларускіх харэографаў на сучасную тэму | 4 | |
| *Тэма 6.* Выканальніцкае майстэрства артыстаў беларускага балета | 2 | |
| *Тэма 7.* Балетмайстарская дзейнасць В. Елізар’ева | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Харэаграфія на рубяжы XX–XXI стст. | 2 | |
| *Тэма 9.* Сучасны танец | 2 | 2 |
| **Усяго…** | **120** | **22** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Харэаграфічнае мастацтва як адна з форм грамадскай свядомасці. Спецыфіка адлюстравання рэчаіснасці ў харэаграфіі, асаблівасці яе вобразнай сістэмы.

Віды, роды, жанры харэаграфічнага мастацтва. Народны, народна-сцэнічны, класічны, характарны, бальны танцы, іх выяўленчыя сродкі. Балет, яго сцэнічная прырода. Сувязь харэаграфіі з іншымі відамі мастацтва.

Сацыяльная прырода харэаграфічнага мастацтва. Яго сувязь з эканамічнымі, гістарычнымі, геаграфічнымі, ідэалагічнымі, сацыяльнымі фактарамі. Выяўленне ў танцы нацыянальнага характару народа. Увасабленне ў танцы эстэтычных ідэалаў эпохі.

## Раздзел І. Харэаграфічнае мастацтва замежных краін

### *Тэма 1. Старажытныя формы танца*

Узнікненне танцавальнага мастацтва ў першабытным грамадстве. Канцэпцыі паходжання мастацтва. Сувязь танца з культурнымі абрадамі, адлюстраванне ў іх працоўных працэсаў, палявання, вайны. Роля танца ў жыцці першабытных людзей. Значэнне археалагічных і этнаграфічных матэрыялаў для вывучэння танца.

Старажытнаегіпецкая танцавальная культура. Танцы рытуальныя і свецкія, мужчынскія і жаночыя.

### *Тэма 2. Харэаграфічная культура Старажытнай Грэцыі*

Сувязь мастацтва з міфалогіяй, з асноўным эстэтычным ідэалам старажытных грэкаў – уяўленні аб гарманічным, здаровым целе і духу чалавека. Харэаграфія на святкаваннях у гонар бога Дыяніса. Грамадскія, рытуальныя і сцэнічныя танцы (лірычныя, спартыўныя танцы, танец у п’есах Эсхіла, Сафокла, Эўрыпіда, Арыстафана). Іх кампазіцыйная пабудова, пластыка, касцюмы, маскі. Лукіян пра пазнавальнае і выхаваўчае значэнне танцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Харэаграфічнае мастацтва Сярэдневякоўя і эпохі Адраджэння*

Дамінуючая роля рэлігіі і ідэалогіі феадальнага грамадства. Барацьба царквы з народным мастацтвам. Гістрыёны, жанглёры, шпільманы – першыя прафесійныя акцёры. Народны танец бранль, яго разнавіднасці. «Гульня пра Робіна і Марыён». Першыя трактаты пра танец Дамініка да П'ячэнцы, Гульельма, Карнацана.

Гуманістычная і рэалістычная накіраванасць культуры і мастацтва Рэнесансу.

Шырокае распаўсюджанне бытавога танца ў Італіі, з'яўленне прафесіі настаўніка танцаў. Стварэнне ў сярэдзіне XV ст. першых харэаграфічных спектакляў, іх сінтэтычны характар. Прафесійныя акцёры – выканаўцы інтэрмедый у XVI ст.

Фабрыцыя Кароза і Чэзарэ Негры – заснавальнікі італьянскай школы танца. Элементы харэаграфіі ў камедыі масак (дэль артэ). Танец як сродак вобразнай характарыстыкі яе персанажаў (Арлекіна, Каламбіны, Капітана).

Народныя і прыдворныя танцы як аснова ўзнікнення балета ў Англіі. «Маскі» – тэатралізаваныя прадстаўленні са спевамі, танцамі, дэкаратыўным афармленнем (XVI ст.). Роля харэаграфіі ў творах Шэкспіра. Арганічная сувязь танца і пантамімы з драматургіяй.

Развіццё танцавальнай культуры ў Францыі. Народныя танцы бурэ, рыгадон, менуэт, вольта. Прыдворныя танцы – павана, куранта. Розныя стылі іх выканання. Дзейнасць балетмайстра Бальтазарыні, яго «Камедыйны балет каралевы» (1581) як першы французскі драматычны балет. Міфалагічны сюжэт балета. Работа пра танец Туана Арбо (1588).

### *Тэма 4. Харэаграфічнае мастацтва класіцызму (XVII ст.)*

Эстэтыка класіцызму і французскі балетны тэатр. Балетымаскарады, драматычныя балеты, балеты з выхадамі. Блізкасць бытавога і сцэнічнага танцаў.

Жан Батыст Мальер (1632–1673) і яго роля ў развіцці французскага балета. Стварэнне Мальерам жанру камедыі-балета («Дакучныя», «Шлюб супраць волі», «Мешчанін у дваранах», «Уяўны хворы»). Рэалістычныя тэндэнцыі і вырашэнні танцавальных і пантамімных сцэн. Дзейнасць кампазітара Ж.-Б. Люлі, значэнне яго твораў для развіцця балетнага тэатра.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балетмайстар Ш. Л. Башан, яго пастаноўка «Трыумф кахання», распрацоўка ім норм сцэнічнага танца, фіксацыя пяці асноўных пазіцый ног.

Заснаванне ў 1661 г. Каралеўскай акадэміі танца, яе дзейнасць па сістэматызацыі танцаў і танцавальных рухаў. Арганізацыя публічных балаў. Адкрыццё ў 1671 г. Каралеўскай акадэміі музыкі (пазней Нацыянальнага тэатра оперы). Выхад на сцэну першых прафесійных танцоўшчыц-жанчын (Лафантэн).

### *Тэма 5. Харэаграфічнае мастацтва эпохі Асветніцтва (XVIII ст.)*

Асноўныя ідэйна-эстэтычныя прынцыпы асветнікаў. Дэмакратычныя і рэалістычныя тэндэнцыі ў тэатральным і харэаграфічным мастацтве. Барацьба за рэформу балета, ператварэнне яго ў самастойны жанр.

Крытыка французскімі асветнікамі прыдворна-арыстакратычнага балета. Русо і Вальтэр пра танцы і акцёрскае майстэрства артыстаў балета. Наватарскія рысы ў творчасці Франсуазы Прэво і Мары Сале. Рэалістычная пантаміма ў балетах «Пігмаліён», «Вакх і Арыядна» (1734). Балетныя творы кампазітара Ж.-Ф. Рамо, іх галантна-арыстакратычны характар. Музычныя рэформы К. Глюка. Народныя крыніцы, стылявое адзінства яго танцавальнай музыкі. Адкрыццё школы танца (1713).

Жан-Жорж Навер (1727–1810) – вялікі рэфарматар балетнага тэатра, выказнік ідэй асветніцтва. Барацьба Навера за вядучую ролю драматургіі ў балетным спектаклі, адзінства музыкі і харэаграфіі, рэформу ў касцюме. Дзейсны танец і пантаміма ў балетах Навера «Медэя і Язон», «Амур і Псіхея», «Індыйскі балет», «Агамемнон». Супрацоўніцтва з кампазітарамі К. Глюкам, В. Моцартам. Тэарэтычная праца Навера «Пісьмы пра танец і балеты» (1760). Значэнне дзейнасці Навера для развіцця харэаграфічнага мастацтва наступных эпох.

Народнае танцавальнае мастацтва ў перыяд французскай буржуазнай рэвалюцыі, шырокае распаўсюджванне фарандолы, карманьёлы, кантраданса. Танцы на прыдворных балах (менуэт, гавот, паланэз). Уплыў народнай творчасці на прафесійнае харэаграфічнае мастацтва.

Балетмайстар Жан Даберваль – паслядоўнік ідэй Навера, стваральнік жанру камедыйнага балета. Яго балеты «Дэзерцір»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і «Марная перасцярога» (1789). Дэмакратычнасць зместу яго балетаў, зварот да нацыянальнай харэаграфіі. Аналіз драматургіі і выяўленчых сродкаў балета. Сцэнічны лёс балета «Марная перасцярога». Выканальніцкае майстэрства Л. Дзюпрэ, М. Камарго, А. Вястрыса. Французская школа класічнага танца.

Харэаграфічнае мастацтва Англіі. Значэнне творчасці знакамітага трагічнага акцёра Гарыка, прыхільніка ідэй Навера, для развіцця англійскага харэаграфічнага мастацтва. Дзейнасць Джона Рыча і Джона Уівера. Пантамімныя і танцавальна-драматычныя балеты.

Харэаграфічнае мастацтва Італіі. Г. Андж’ёліні – аўтар вялікіх балетных спектакляў. Сальватор Вігана – паслядоўнік Навера, стваральнік музычна-танцавальнай драмы. Спектаклі на тэму шэкспіраўскіх твораў («Атэла»), на рускую тэму («Соф’я Маскоўская, або Стральцы»). Пастаноўка балета «Тварэнні Праметэя» на музыку Л. Бетховена. Філасофская накіраванасць балета. Работа С. Вігана над масавымі сцэнамі, адмаўленне ад дывертысмента. Стэндаль пра творчасць С. Вігана. Італьянская школа класічнага танца.

*Тэма 6. Харэаграфічнае мастацтва XIX ст.*

Бытавыя танцы першай паловы XIX ст. Шырокае распаўсюджванне вальса, polькі, кадрылі. Танцавальная творчасць І. Штрауса. Гістарычныя ўмовы ўзнікнення рамантызму, яго асноўныя ідэйна-мастацкія прынцыпы. Развіццё двух кірункаў рамантызму ў харэаграфічным мастацтве. Абнаўленне выяўленчых сродкаў балета. Музычная драматургія рамантычных спектакляў. Балетная музыка Адольфа Адана. Элементы сімфанізму ў музыцы і харэаграфіі.

Філіп Тальёні і яго балет «Сільфіда» на музыку Ж. Шнейцгофера (1832). Аналіз яго драматургіі і выяўленчых сродкаў. Марыя Тальёні – выдатная танцоўшчыца эпохі рамантызму. Стыль выканальніцкага майстэрства М. Тальёні, танец «на пуантах».

Ж. Перо – прадстаўнік рамантызму ў балетным мастацтве. Творчая дзейнасць. Імкненне Перо да рэалістычных сюжэтаў і вобразаў у пастаўленых ім балетах Ц. Пуні «Эсмеральда», «Фаўст», «Ундзіна». «Карсар» А. Адана і яго сцэнічнае жыццё. Дзейнасць Ж. Перо ў Расіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балет «Жызэль» (сцэнарый Т. Гацье, музыка А. Адана, харэаграфія Ж. Перо, Ж. Каралі, 1841) – вяршыня рамантычнага балета. Аналіз яго вобразнай сістэмы, сцэнічны лёс балета.

Выканальніцкае майстэрства Фані Эльслер, нацыянальны характар яе танцаў.

Карла Блазіс – выдатны італьянскі балетмайстар, педагог, тэарэтык. Работа К. Блазіса ў Маскве.

Аўгуст Бурнанвіль – вядомы дацкі балетмайстар, педагог, тэарэтык. Яго цікавасць да нацыянальнай тэматыкі і народных традыцый. Харэаграфічная пастаноўка на рускую тэму – балет «З Сібіры ў Маскву» на музыку Мелера. Выказванні А. Бурнанвіля пра рускі балет. Значэнне яго педагагічнай сістэмы для развіцця дацкай школы балета.

Распаўсюджванне ў бытавым танцавальным мастацтве краін Еўропы афрыканскіх і лацінаамерыканскіх форм і рытмаў (тустэп, кекуок, танга, бастон і інш.).

Заняпад балетнага мастацтва еўрапейскіх краін, збядненне ідэйна-мастацкага зместу балетаў, пагоня за знешняй эфектнасцю формы.

Дзейнасць балетмайстра А. Сен-Леона. Адраджэнне балета-феерыі, самагодная віртуознасць у выканальніцкім майстэрстве. Выкарыстанне А. Сен-Леонам народных танцаў, прынцыпы іх стылізацыі.

Прагрэсіўнае значэнне балетнай творчасці кампазітара Л. Дэліба. Імкненне яго да сімфанізацыі музыкі, індывідуалізацыі і рэалістычнасці музычных характарыстык. П. І. Чайкоўскі пра музыку Л. Дэліба. Балет Л. Дэліба – А. Сен-Леона «Капелія» (1870).

Крызіс балетнага мастацтва на мяжы XIX–XX стст., уплыў на яго мадэрнісцкіх напрамкаў у жывапісе, музыцы, тэатры.

*Тэма 7. Харэаграфія XX ст.*

Папярэднікі стварэння новай пластычнай мовы. Ідэі Ф. Дэльсарта і Э. Жака-Далькроза. Імкненне расказаць аб унутраным свеце чалавека з дапамогай рухаў і жэстаў, якія непасрэдна выяўляюць душэўныя парывы. Творчасць і асоба Айседоры Дункан (1877–1927). Яе свабодная імправізацыя на сімфанічную музыку. Агульныя філасофскія і эстэтычныя прынцыпы мадэрну. Змена паняцця прыгажосці, апазіцыя класічнаму танцу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нямецкая школа экспрэсіянізму. Рудольф фан Лабан, Курт Ёс, Мэры Вігман.

«Тэатр танца» Піны Бауш. Адмова ад наратыўнасці, калажы, элементы абсурдызму ў яе пастаноўках, увасабленне прынцыпу «любы рух можа стаць танцам».

Танец у Амерыцы. Школа «Дэнішоўн», творчасць Марты Грэхэм. Джордж Баланчын і «неакласіка». Багацце лексікі яго балетаў, бессюжэтнасць, «нараджэнне танца з духу музыкі». «Хрустальны палац», «Сімфонія дзікага Захаду», «Апалон Мусагет» і іншыя пастаноўкі.

Спектаклі французскіх балетмайстраў Ралана Пеці («Юнак і смерць», «Кармэн», «Сабор Парыжскай Богамацеры») і Марыса Бежара («Балеро», «Вясна свяшчэнная», «Queen і Моцарт»). Абвастрэнне пластычнай выразнасці, сінтэтычнасць, розныя крыніцы мастацкіх задум.

Уплыў на харэаграфію розных напрамкаў заходняга мастацтва. Руханне яе ад мадэрну да постмадэрну.

Творчасць буйнейшых харэографаў XX ст. Матс Эк, абнаўленне ім класічных балетных міфалагем. Аналіз сучаснай рэдакцыі «Жызэлі». Пастаноўкі «Спячая прыгажуня», «Кармэн», «Дом Бернарды Альбы».

Джон Наймаер. Імкненне да вялікай формы. Аўтарскія версіі класічных балетаў, танцсімфоній (на музыку А. Малера), сучасныя сюжэтныя спектаклі («Атэла», «Ніжынскі»), іх насычаная драматургія.

Іржы Кіліян і яго бессюжэтныя балеты («Сімфонія рэ мажор», «Шэсць нямецкіх танцаў», «Вяртанне ў чужую краіну» і інш.). Гранічная пластычная вынаходлівасць, пачуццё гумару.

### *Тэма 8. Харэаграфія на рубяжы XX–XXI стст. Сучасны танец*

Асноўныя рысы харэаграфіі рубяжа XX–XXI стст., разнастайнасць пошукаў, імкненне да аднаўлення выразных сродкаў, «дэканструкцыі» класічнага танца. Сувязь з іншымі плынямі ў мастацтве нашых дзён – візуальнымі, мультымедыйнымі, перформансам.

Творчасць амерыканскага харэографа Мэрса Канінгема – заснавальніка танцавальнага мадэрну. Дамінуючая роля ў яго сачыненнях выпадку, адвольнага камбінавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Серыя пластычных кампазіцый «Выпадак», балеты «Змяняючы крок», «Як падыйсці, ударыць, уцячы і ўпасці». Наяўнасць фармальных прыёмаў, барацьба з культурнымі стэрэатыпамі. Садружнасць з кампазітарам Дж. Кэйджам.

Рухомы радыкалізм Уільяма Фарсайта, пошукі новай выразнасці цела. Балет «Любоўныя песні».

## Раздзел II. Руская харэаграфія

### *Тэма 1. Рускае харэаграфічнае мастацтва ад вытокаў да ўзнікнення балетнага тэатра*

Роля харэаграфіі ў старажытных абрадах і гульнях. Каляндарная і сямейна-бытавая абраднасць.

Сінкрэтычнасць карагодаў. Адлюстраванне ў іх розных бакоў жыцця народа. Мастацтва скамарохаў, яго дэмакратычная, антыцаркоўная накіраванасць. Танец у народнай драме, народным лялечным тэатры.

Роля танцавальнага фальклору ў фарміраванні прафесійнай харэаграфіі.

### *Тэма 2. Пачатак харэаграфічнага тэатра ў Расіі (XVII – першая палова XVIII ст.)*

Гістарычныя ўмовы фарміравання балетнага тэатра. «Балет пра Арфея і Эўрыдзіку» (1673). Харэаграфія і афармленне першых балетаў.

Роля харэаграфічнага мастацтва ў эпоху Пятра І. Бальны танец на асамблеях, выкладанне танца ў навучальных установах. Адкрыццё ў 1738 г. у Пецярбургу першай балетнай школы Ш. Б. Ландэ. Спектаклі школы і іх значэнне для развіцця рускага балетнага тэатра.

Арганізацыя першага ў Расіі оперна-балетнага тэатра (1756).

### *Тэма 3. Харэаграфічнае мастацтва другой паловы XVIII – пачатку XIX ст.*

Эстэтыка класіцызму і яе ўплыў на рускае харэаграфічнае мастацтва. Балеты на тэму твораў А. Сумарокава, элементы нацыянальнага фальклору на рускай сцэне. Выканальніцкае майстэрства Т. Бублікава.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спектаклі паслядоўнікаў Навера балетмайстраў Ф. Гільфердзінга, Г. Андж’ёліні, Ле Піка.

Адкрыццё публічнага операна-балетнага тэатра ў Маскве (1753) і маскоўскай балетнай школы (1773), іх роля ў развіцці рускай харэаграфіі.

Прыгонны балет, гістарычныя ўмовы яго існавання. Рэпертуар і тэматыка балетных спектакляў. Выканальніцкае майстэрства прыгонных артыстаў (Т. Шлыкава-Гранатава), іх трагічнае становішча.

Дзейнасць першага рускага балетмайстра І. І. Вальберха (1766–1849). Адлюстраванне тэндэнцый класіцызму і сентыменталізму ў яго харэаграфічнай дзейнасці. Літаратурная тэматыка яго спектакляў. Балет «Новы Вертэр» (1799) на музыку С. Цітова, яго наватарская накіраванасць. Кніга І. І. Вальберха «З дзённіка балетмайстра».

Дывертысменты і інтэрмедыі на народныя тэмы («Сёмік, або Гулянне ў Мар’іным гаі»). Патрыятычная тэма ў дывертысменце часоў вайны з Напалеонам («Апалчэнне, або Любоў да Айчыны»).

*Тэма 4. Харэаграфічнае мастацтва першай паловы XIX ст.*

Шарль Дзідло (1767–1837) і рускі балетны тэатр. Асноўныя этапы творчасці Ш. Дзідло і тэматыка яго балетаў. Асаблівасці ідэйна-эстэтычнай праграмы Ш. Дзідло, жанравая шматвобразнасць яго спектакляў. Балеты анакрэантычныя («Зефір і Флора», «Ацiс і Галатэя»), казачныя («Хензі і Тао»), рамантыка-драматычныя («Тэзей і Арыяна»). Балет «Каўказскі палоннік» па паэме А. С. Пушкіна на музыку Кавоса, адлюстраванне ў ім ідэй рамантызму. А. Пушкін пра Ш. Дзідло.

Дзейнасць А. П. Глушкоўскага (1793 – каля 1870) як танцоўшчыка, балетмайстра, педагога маскоўскага балета.

Значэнне яго дзейнасці для развіцця рускага нацыянальнага балетнага тэатра. Балеты на пушкінскую тэматыку («Руслан і Людміла», 1821; «Чорны шаль», 1831), іх мастацкія асаблівасці і выяўленчыя сродкі. А. Глушкоўскі як тэарэтык, яго кніга «Успаміны балетмайстра».

Рамантычны балет на рускай сцэне. Гастролі М. Тальёні, Ф. Эльслер, К. Грызі. Дзейнасць у Расіі балетмайстра Ж. Перо. Яго балеты на музыку Ц. Пуні «Эсмеральда» (1848), «Ката-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рына, дачка разбойніка», «Фаўст». Балеты А. Адана «Карсар», «Жызэль» і іх лёс на рускай сцэне.

Выканальніцкае майстэрства артыстаў рускага балета. Асноўныя рысы творчых індывідуальнасцей Я. Коласавай, А. Істомінай, К. Целешавай, К. Санкоўскай і рамантычны балет на рускай сцэне. Першая руская Жызэль – А. Андрэянава. Народныя танцы ў рэпертуары А. Андрэянавай.

М. І. Глінка і балетны тэатр. Наватарства музыкі кампазітара ў танцавальных сцэнах опер «Іван Сусанін» і «Руслан і Людміла».

Руская прагрэсіўная грамадская думка пра шляхі развіцця і грамадскую значнасць балетнага мастацтва.

*Тэма 5. Харэаграфічнае мастацтва XIX ст.*

Грамадскае становішча ў Расіі 50–60-х гг. Крызіс балетнага мастацтва, крытыка яго Салтыковым-Шчадрыным і Някрасавым. Творчасць Артура Сен-Леона – характэрная з’ява для балетнага тэатра гэтага перыяду. Забаўляльнасць і відовішчнасць балетаў Сен-Леона. Стылізацыя ім народных танцаў, захапленне тэхніцызмам. Балет «Канёк-Гарбунок» Ц. Пуні, супярэчнасць яго вырашэння. Балет «Капелія» Л. Дэліба (1870), яго музыка і харэаграфія. Сцэнічны лёс балета.

Творчасць у Маскве балетмайстра С. Сакалова. Народная тэматыка і нацыянальныя танцы ў яго спектаклях «Папараць, або Ноч на Івана Купалу», «Цыганскі табар», «Апошні дзень жніва». Наватарскія рысы харэаграфіі С. Сакалова.

М. Пеціпа (1818–1910) і асноўныя этапы яго творчага шляху.

Балеты «Дачка фараона» Ц. Пуні і «Дон Кіхот» Л. Мінкуса – іх харэаграфія і выяўленчыя сродкі.

Балет Л. Мінкуса «Баядэрка» (1877). Аналіз яго структуры. Прынцып танцавальнага сімфанізму ў акце «Цені».

Творчая садружнасць М. Пеціпа і П. Чайкоўскага. П. І. Чайкоўскі – рэфарматар балетнай музыкі, родапачынальнік сімфанічнага балета.

Балет П. Чайкоўскага – М. Пеціпа «Спячая прыгажуня» (1890). Аналіз яго харэаграфіі.

Балет А. Глазунова – М. Пеціпа «Раймонда» (1898).

Л. Іваноў (1834–1901), асаблівасці яго творчай індывідуальнасці, імкненне да адзінства музычна-харэаграфічных вобразаў. Балет Чайкоўскага – Іванова «Шчаўкунок» (1892). Балет

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Чайкоўскага – Пеціпа – Іванова «Лебядзінае возера» (1894). Аналіз яго драматургіі і вобразнасці. Наватарства харэаграфіі «лебядзіных» актаў. Сцэнічнае жыццё балета. Значэнне творчасці М. Пеціпа і Л. Іванова для рускай і сусветнай харэаграфіі.

*Тэма 6. Руская харэаграфія XX ст.*

А. А. Горскі (1871–1924), накіраванасць яго пошукаў, сувязь з прагрэсіўнымі мастацкімі тэндэнцыямі эпохі. Новыя рэдакцыі балетаў «Дон Кіхот» і «Лебядзінае возера». Балеты «Дачка Гудулы» на музыку Сімона (1902) і «Саламба» на музыку Арэндса (1910). Значэнне творчасці А. Горскага для развіцця маскоўскага і рускага балета.

Творчасць М. М. Фокіна (1880–1942), яго наватарская сутнасць. Абнаўленне ў яго спектаклях выяўленчых сродкаў, лексікі. Іх харэаграфічная структура. Музыка і сцэнаграфія ў балетах М. Фокіна. Садружнасць з Бакстам, Бенуа, Рэрыхам. Аднаактавыя балеты «Павільён Арміды» Арэнскага, «Шапэніяна» (1907), «Егіпецкія ночы», «Палавецкія танцы» (1909), «Жар-птушка» (1910). Аналіз балета «Пятрушка» (1911) І. Стравінскага. Спектаклі М. Фокіна ў «Рускіх сезонах» у Парыжы. Педагагічная дзейнасць М. Фокіна. Яго кніга «Супраць плыні».

Значэнне «Рускіх сезонаў» у Парыжы для развіцця еўрапейскай харэаграфіі.

*Тэма 7. Выканальніцкае мастацтва майстроў рускага балета XX ст.*

Асаблівасці рускай выканальніцкай харэаграфічнай школы.

Ганна Паўлава (1881–1931) – вялікая руская балерына. Яе роля ў прапагандзе рускага балета і развіцці мастацтва харэаграфіі. Асноўныя ролі Г. Паўлавай (Жызэль, Нікія, Аўрора, Клеапатра і інш.), асаблівасці творчай індывідуальнасці. Выкананне Г. Паўлавай мініяцюры Сен-Санса – М. Фокіна «Паміраючы лебедзь». Замежныя гастролі трупы Г. Паўлавай, сусветны друк пра мастацкае значэнне яе творчасці.

Вацлаў Ніжынскі (1880–1950) – выдатны рускі танцоўшчык. Рознабаковасць створаных ім вобразаў, іх экспрэсіўнасць і псіхалагічная глыбіня. В. Ніжынскі – Альберт, Пятрушка, Блакітны бог, Раб. Удзел Ніжынскага ў «Рускіх сезонах» у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Парыжы. Пастаноўкі В. Ніжынскага – «Вясна свяшчэнная» І. Стравінскага (1913) і інш.

Тамара Карсавіна (1885–1978) – выдатная руская балерына. Ролі Карсавінай у балетах М. Фокіна «Жар-птушка», «Пятрушка», «Уяўленне ружы», удзел яе ў «Рускіх сезонах» у Парыжы. Педагагічная дзейнасць Т. Карсавінай у Англіі, яе кніга «Тэатральная вуліца».

## Раздзел ІІІ. Савецкае і рускае харэаграфічнае мастацтва

*Тэма 1. Савецкі балетны тэатр першага дзесяцігоддзя XX ст.*

Дэмакратызацыя гледача. Выступленні артыстаў балетнай трупы перад працоўнымі фабрык, заводаў. Барацьба за захаванне і развіццё рэалістычных традыцый рускай харэаграфіі. Аднаўленне на балетнай сцэне спектакляў класічнага рэпертуару А. Горскім і В. Ціхаміравым («Шчаўкунок», «Лебядзінае возера», «Баядэрка», «Спячая прыгажуня», «Жызэль», «Эсмеральда»). Эксперыментальная пастаноўка «Шчаўкунка» Ф. Лапуховым у 1929 г.

Зварот да новай тэматыкі (балет «Сценька Разін» на музыку А. Глазунова, 1918). Творчая дзейнасць і пастаноўкі балетмайстраў К. Галяйзоўскага («Смерч» Б. Бера, «Іосіф Прыгожы» С. Васілёнка, стварэнне трупы «Камерны балет» у 1922), Ф. Лапухова (харэаграфічныя спектаклі «Веліч сусвету» на музыку Чацвёртай сімфоніі Бетховена, «Чырвоная віхура» У. Дзешавова, «Ледзяная дзева» Э. Грыга). Значэнне іх творчай дзейнасці для развіцця савецкай харэаграфіі.

Балет Р. Гліэра «Чырвоны мак» (пастановачная група ў складзе В. Ціхамірава, Л. Лашчыліна, М. Курылкі, 1927) – этапны спектакль у станаўленні савецкага балетнага тэатра. Рысы наватарства і даніна традыцыяналізму ў мастацкім вырашэнні балета. Вобразы савецкіх маракоў і танец «Яблычак». Тао-Хоа – К. Гельцэр. Далейшае жыццё балета.

Выканальніцкае майстэрства артыстаў савецкага балета першага дзесяцігоддзя.

К. Гельцэр (1876–1962) – першая народная артыстка РСФСР. Ролі К. Гельцэр (Раймонда, Эсмеральда, Мядора, Тао-Хоа і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пачатак творчага шляху вядомых майстроў савецкага балета М. Сямёнавай, В. Чабукіяні, А. Ермалаева. Аднаўленне імі стылю танца. Гераічныя рысы ў іх выканальніцкім майстэрстве, ускладненне тэхнікі.

*Тэма 2. Савецкі балетны тэатр 30-х гг. XX ст.*

Уплыў на харэаграфію дасягненняў тэатра, літаратуры, кіно. Вузкае разуменне рэалізму на балетнай сцэне ў гэты перыяд. Асаблівасці балетнай рэжысуры, імкненне да жыццёвай праўдзівасці. Паглыбленне псіхалагічнай змястоўнасці харэаграфічных вобразаў, пашырэнне тэматыкі балетных спектакляў.

Балет Б. Асаф'ева – В. Вайнонена «Полымя Парыжа» (1932) як народна-гераічная драма. Роля народнага танца ў стварэнні абагульненага вобраза паўстаўшага народа.

Балет Б. Асаф'ева – Р. Захарава «Бахчысарайскі фантан» (1934). Сцвярджэнне на балетнай сцэне пушкінскай «Ісціны страсцей». Псіхалагічная глыбіня вобразаў, дзейсныя харэаграфічныя маналогі і дыялогі герояў. Цэласнасць харэаграфічнай драматургіі, асаблівасці рэжысуры. Выкананне партыі Г. С. Уланавай.

Балеты на літаратурную тэматыку («Страчаныя ілюзіі» і «Каўказскі палоннік» Б. Асаф'ева – Р. Захарава, «Лаўрэнсія» А. Крэйна – В. Чабукіяні і інш.), іх дасягненні і пралікі. Асноўныя прынцыпы эстэтыкі «харэадрамы», яе роля ў развіцці савецкага балета.

Балет «Рамэа і Джульета» С. Пракоф'ева – Л. Лаўроўскага (1940) – яркае харэаграфічнае ўвасабленне шэкспіраўскіх вобразаў. Г. С. Уланава – Джульета. Аналіз музычнай драматургіі балета, яго харэаграфічнай структуры. Выканаўцы галоўных партый: К. Сяргееў, М. Габовіч – Рамэа, С. Корань – Мяркуцыа, А. Ермалаеў – Тыбальд. «Рамэа і Джульета» як своеасаблівы вынік і вяршыня творчых пошукаў харэографаў 30-х гг. Далейшы лёс балета.

Творчасць балетмайстраў В. Вайнонена, Р. Захарава, Л. Лаўроўскага і іх роля ў развіцці савецкай харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 3. Выканальніцкае майстэрства савецкіх артыстаў балета ў 30-я гг. XX ст.*

Наватарскія рысы ў выканальніцкім майстэрстве савецкіх артыстаў балета. Псіхалагічная глыбіня і гераічны пафас створаных імі вобразаў.

Асноўныя асаблівасці педагагічнай сістэмы А. Я. Ваганавай, яе значэнне для савецкага балета, наследаванне лепшых традыцый рускай школы танца, яе адрозненне ад французскай і італьянскай. Кніга А. Ваганавай «Асновы класічнага танца» – асноватворная праца савецкай харэаграфічнай педагогікі, яе роля ў развіцці сусветнага балета.

Выканальніцкае майстэрства выдатных майстроў рускага балета М. Сямёнавай, А. Ермалаева, В. Чабукіяні, Н. Дудзінскай, В. Лепяшынскай, К. Сяргеева, М. Габовіча. Ролі, створаныя імі ў балетах 30-х гг.

### *Тэма 4. Ансамбль танца – новы жанр харэаграфічнага мастацтва*

Першая Усесаюзная алімпіяда мастацкай самадзейнасці (1932). Усесаюзны фестываль народнага танца ў Маскве і Міжнародны фестываль народнага танца ў Лондане (1936).

Арганізацыя ў краіне аматарскіх і прафесійных ансамбляў песні і танца, якія працуюць на аснове народнай творчасці. Прынцыпы іх работы з фальклорам, мастацкая апрацоўка народных узораў.

Стварэнне ў 1937 г. першага ў свеце Ансамбля народнага танца СССР пад кіраўніцтвам І. А. Маісеева.

Рэпертуар Дзяржаўнага ансамбля танца СССР. Харэаграфічныя карціны на сучасныя тэмы: «Дзень на караблі», «Партызаны», «Футбол», «Віва, Куба». Рускія танцы «Вензелі», «Палянка» і інш. Танцы народаў СССР («Бульба», «Юрачка», «Жок», «Пахта») і народаў свету («Мексіканская сюіта», «Тарантэла», «Танцы славянскіх народаў») у праграме калектыву. Фальклорны танец і метады яго мастацкай апрацоўкі. Роля ансамбля ў прапагандзе савецкага мастацтва.

Акадэмічны харэаграфічны ансамбль танца «Бярозка» (1948), пастаноўкі Н. Надзеждзінай, сінтэз класічнага і народнага танца.

Ансамбль народнага танца УССР (1937). Стваральнік і першы кіраўнік калектыву П. П. Вірскі (1905–1975), найбольш

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цікавыя яго работы («Падаляначка», «Паўзунец», «Па кім вярба плача», «Запарожцы», «Рукадзельніца» і інш.).

Узбекскі ансамбль танца пад кіраўніцтвам Тамары Ханум.

Танцавальная група рускага народнага хору імя Пятніцкага. Кіраўнік Т. А. Усцінава.

*Тэма 5. Нараджэнне і развіццё балетных тэатраў у нацыянальных рэспубліках*

Нараджэнне балетных тэатраў у нацыянальных рэспубліках. Выхад народнага танца на сцэну, з'яўленне балетных калектываў унутры музычна-драматычных тэатраў. Дапамога дзеячаў рускай харэаграфіі ў засваенні класічнага танца, у стварэнні нацыянальных балетаў.

Першыя нацыянальныя харэаграфічныя спектаклі, створаныя ў рэспубліках: «Сэрца гор» А. Баланчывадзэ – В. Чабукіяні, «Салавей» М. Крошнера – А. Ермалаева, «Лілея» К. Даньковіча – Г. Бярозавай, «Гулям-дом» Я. Брусілоўскага – І. Арбатава, Т. Ханум, «Дзявочая вежа» А. Бадалбейлі – С. Кеваркова, В. Вронскага і інш. Узаемадзеянне ў іх класічнага і народнага танцаў, зварот да нацыянальнай тэматыкі. Дэкады нацыянальнага мастацтва ў Маскве, іх роля ў развіцці харэаграфічнага мастацтва.

*Тэма 6. Савецкая харэаграфія 50–60-х гг. XX ст.*

Творчая дзейнасць балетных тэатраў у пасляваенныя гады.

Спектаклі на літаратурную тэматыку: «Папялушка» С. Пракоф'ева – Р. Захарава, «Медны коннік» Р. Гліэра – Р. Захарава, «Доктар Айбаліт» І. Марозава – М. Холфіна (у Маскве), Б. Фенстэра (у Ленінградзе) і інш. Іх выяўленчыя сродкі.

Вырашэнне на балетнай сцэне сучаснай тэмы. Негатыўныя бакі збліжэння балета з драматычным тэатрам. Імкненне да натуралістычнага праўдападабенства, адсутнасць шырокай танцавальнасці. Абмежаванасць разумення рэалізму ў балеце. Балет «Родныя палі» М. Чэрвінскага – А. Андрэева (1953) – квінтэсэнцыя драматычнага балета. Дыскусіі пра лёс балетнага мастацтва і спецыфіку харэаграфічнай вобразнасці.

Стварэнне новых прафесійных калектываў народнага танца (Ансамбль народнага танца Грузіі пад кіраўніцтвам Н. Рамішвілі і І. Сухішвілі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Балет «Каменная кветка» С. Пракоф’ева – Ю. Грыгаровіча (1957) – зварот да паэтычна-абагульненай харэаграфіі. Сімфанізацыя танца, прынцыпы пабудовы музычна-харэаграфічнай драматургіі, абнаўленне лексікі. І. Калпакова і А. Асіпенка – выканаўцы роляў Кацярыны і Гаспадыні Меднай гары. Вобраз Данілы і Севяр’яна. Сцэнаграфія балета мастака С. Вірсаладзэ.

Балет А. Пятрова – І. Бельскага «Бераг надзеі». Адмаўленне ад прыземленага бытападабенства, абагульненасць і сучаснасць пластычнай мовы (танцы рыбакоў, чаек). Рамантычная прыўзнятасць вобразаў.

Харэаграфічныя пастаноўкі Ф. Лапухова (харэаграфічныя мініяцюры на музыку М. Мусаргскага «Карцінкі з выстаўкі»), К. Галяйзоўскага («Скрабініяна», «Лейлі і Меджнун» С. Баласаняна), Л. Якабсона (балет «Спартак» А. Хачатурана, «Клоп» Ф. Атказава і Г. Фірціча, «Дванаццаць» Б. Цішчанкі, «Харэаграфічныя мініяцюры»), К. Сяргеева («Сцяжынай грому» К. Караева), Л. Лаўроўскага («Паганіні» С. Рахманінава, «Начны горад» Б. Бартака), В. Чабукіяні («Атэла» А. Мачаварыяні).

Творчая дзейнасць Ю. Грыгаровіча. Аналіз яго балетаў «Легенда пра каханне» А. Мелікава і «Спартак» А. Хачатурана. Іх роля ў развіцці савецкай харэаграфіі. Балеты на музыку С. Пракоф’ева «Іван Грозны» і «Рамэа і Джульета». Новае прачытанне Ю. Грыгаровічам класічных балетаў. «Ангара» А. Эшпая (1976) – зварот балетмайстраў да сучаснай тэмы. Балет на музыку Д. Шастаковіча «Залаты век».

Творчая дзейнасць І. Бельскага, яго балеты «Ленінградская сімфонія» на музыку Д. Шастаковіча, «Канёк-Гарбунок» Р. Шчадрына.

Харэаграфічная інтэрпрэтацыя сімфанічнай музыкі («1905-ы» Д. Шастаковіча). Наватарскае значэнне пошукаў І. Бельскага.

Выканальніцкае майстэрства Р. Стручковай, Н. Цімафеевай, І. Калпаковай, Б. Брэгвадзэ, М. Фадзеечава, А. Шэлест, А. Лапауры і інш.

Творчая індывідуальнасць М. Плісецкай, яе роля ў папулярызацыі дасягненняў савецкага балета. Плісецкая – Кармэн. Балетмайстарская дзейнасць (суаўтарства ў «Ганны Карэнінай» і «Дамы з сабачкай» з Р. Шчадрыным).

Стварэнне новых прафесійных ансамбляў танца (Дзяржаўны ансамбль народнага танца Малдаўскай ССР «Жок» пад кіраўніцтвам У. Курбета, Краснаярскі ансамбль танца Сібіры пад кіраўніцтвам М. Гадэнкі і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 7. Харэаграфічнае мастацтва канца XX ст.*

Творчая дзейнасць балетмайстра А. Вінаградава. Яго спектаклі на сучасную тэму («Асель» У. Власава, «Гаранка» М. Кажлаева). Эксперыментатарскі характар «Яраслаўны» Б. Цішчанкі. Пошукі харэографамі новых сродкаў выразнасці, ускладненне танцавальнай вобразнасці. Балет «Браняносец Пацёмкін».

Спектаклі, створаныя харэографамі Н. Касаткінай, У. Васілёвым. Іх мастацкія асаблівасці. Балеты «Ваніна Ваніні» і «Гераічная паэма» М. Карэтнікава, «Вясна свяшчэнная» І. Стравінскага, «Стварэнне свету» А. Пятрова. Пошукі новых сродкаў выразнасці, сінтэз класічнага, характарнага і сучаснага танцаў.

Творчасць Д. Брянцава. Яго тэлевізійныя балеты ў супрацоўніцтве з рэжысёрам А. Бялінскім. Імкненне да новых прынцыпаў музычна-харэаграфічнай драматургіі як характэрная рыса пошукаў харэографаў.

Творчасць Б. Эйфмана. Яго балеты, створаныя па літаратурных творах («Дванаццатая ноч», «Ідыёт», «Падпаручнік Рамашоў», «Майстар і Маргарыта», «Ганна Карэніна», «Чайка» і інш.). Аналіз балета «Прасвятленне». Балеты «Чайкоўскі», «Чырвоная Жызэль», «Рускі Гамлет», «Дон Жуан і Мальер», «Анегін. On-line» і інш. Разнастайнасць выяўленчых сродкаў, метафарычнасць мовы харэографа. Санкт-Пецярбургская трупа як аўтарскі балетны тэатр, своеасаблівасць высокага выканальніцкага майстэрства акцёраў.

Творчыя індывідуальнасці артыстаў балета. Выканальніцкая дзейнасць К. Максімавай, У. Васільева, М. Ліепы, М. Лаўроўскага, Н. Бяссмертнавай, Ю. Уладзімірава, Н. Далгушына і інш.

Творчая дзейнасць, асаблівасці мастацкага аблічча і тэндэнцыі развіцця вядучых прафесійных калектываў народнага танца («Гжэль»). Развіццё балетнага мастацтва ва ўмовах СНД. Імкненне да захавання адзінай культурнай тэрыторыі. Спектаклі, створаныя ў краінах Садружнасці.

*Тэма 8. Харэаграфічнае мастацтва ў наш час*

Паняцце contemporary dance. Віды і формы сучаснай пластыкі.

Вядучыя калектывы мадэрн-танца і contemporary dance на тэрыторыі СНД.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ансамбль «Todes» пад кіраўніцтвам А. Духавай. Выканальніцкі стыль калектыву, стварэнне пэўнай мадэлі ўзаемасувязей юнакоў і дзяўчат.

Харэаграфія Я. Панфілава, яго лепшыя пастаноўкі – «Восем рускіх песень», «Рака», «Бабы. 1945-й».

Творчасць Таццяны Баганавай, Аляксандра Пепляева, Вольгі Пона, Сяргея Смірнова, Раду Паклітару.

## Раздзел IV. Беларуская харэаграфія

### *Тэма 1. Беларускае народнае танцавальнае мастацтва, асноўныя этапы яго развіцця*

Сувязь танца з абрадамі, побытам, звычаямі, працоўнай дзейнасцю. Неабходнасць вывучэння фальклору і яго эстэтыкі. Элементы харэаграфіі ў побыце народа, каляндарна-гадавой і сямейнай абраднасці. Класіфікацыя ўзораў народнай танцавальнай творчасці, яе асноўныя прынцыпы. Жанр карагода (карагодныя песні, іграваныя карагоды, карагодныя танцы); танцы (традыцыйныя, кадрылі, полькі, гарадскія бытавыя і бальныя); імправізацыйныя скокі. Беларускі харэаграфічны фальклор у працах П. Шэйна, Е. Раманава, П. Бяссонава, Г. Насовіча, Я. Карскага, І. Сербава, А. Сержпутоўскага, У. Дабравольскага, М. Доўнар-Запольскага, М. Нікіфароўскага, П. Шпілеўскага, А. Кіркора, М. Дзмітрыева, З. Радчанкі і інш. Польскія фалькларысты і этнографы Я. Чарот, Я. Баршчэўскі, А. Рыпінскі, Р. Зянкевіч, М. Федароўскі пра беларускія танцы.

### *Тэма 2. Харэаграфічнае мастацтва да XX ст.*

Элементы харэаграфіі ў народнай драме, у лялечным тэатры-батлейцы, у інтэрмедыях школьнага тэатра. Прыватнаўласніцкія тэатры і танцавальныя школы ў Слуцку (харэографы Пуціні і Дзюпрэ), Нясвіжы (харэограф А. Лойка, балеты «Арфей і Эўрыдзіка», «Пігмаліён»), Слоніме (балеты «Рыбакі», «Балет мельнікаў», «Дэзерцір-балет»), Гродне (харэограф Ле Ду, балеты «Квартэт дудароў», «Балет пекараў», «Балет вясковы»), Шклове. Выканальніцкае майстэрства беларускіх танцораў (А. Лойкі, М. Рымінскага, К. Буткевіча, Я. Палітыкі, К. Азарэвічавай і інш.). Харэаграфія беларускіх прыватнаўлас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ніцкіх тэатраў. Першае з’яўленне народнага танца на сцэне ў 40-х гг. XIX ст. у камічнай оперы С. Манюшкі.

Беларускі харэаграфічны фальклор у «Першай беларускай трупе» І. Буйніцкага, асаблівасці яго сцэнічнай інтэрпрэтацыі.

### *Тэма 3. Станаўленне беларускага балетнага тэатра і прафесійнай харэаграфіі*

Нацыянальная культура пасля 1917 г. Арганізацыя ў рэспубліцы самадзейных танцавальных калектываў (гомельскага Палаца культуры чыгуначнікаў і інш.). Асаблівасці апрацоўкі імі фальклору.

Адкрыццё ў 1920 г. у Мінску Беларускага дзяржаўнага тэатра (БДТ-І). Харэаграфічны фальклор у спектаклях «На Купалле», «Машэка», «Каваль-ваявода». Балетныя пастаноўкі тэатра – «Капелія» Дэліба, «Зачараваны лес» Дрыго, «Фея лялек» Баера.

Адкрыццё ў 1933 г. Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Балет Р. Гліэра «Чырвоны мак». Засваенне традыцый рускага класічнага балета і вывучэнне нацыянальнага харэаграфічнага фальклору – асаблівасці развіцця беларускага балетнага тэатра ў перыяд станаўлення. Стварэнне ў 1940 г. першага нацыянальнага балета («Салавей» М. Крошнера – А. Ермалаева). Народна-гераічная тэма балета, паэтычная абагульненасць вобразаў, наватарства рэжысуры. Сплаў у лексіцы балета элементаў класічнага і народнага танцаў, блізкасць да паэтыкі фальклору. Аналіз драматургіі і выяўленчых сродкаў балета «Салавей».

Творчая дзейнасць прафесійных харэаграфічных калектываў – Ансамбля беларускай народнай песні і танца пры дзяржаўнай філармоніі БССР, Беларускага ансамбля песні і танца, Ансамбля ваеннай акругі.

Дапамога дзеячаў рускай харэаграфіі ў стварэнні нацыянальнага балетнага тэатра.

### *Тэма 4. Балетныя творы беларускіх аўтараў на фальклорную, гістарычную і літаратурную тэматыку*

Стварэнне ў 1949 г. балета «Князь-возера» (музыка В. Залатарова, харэаграфія К. Мулера). Блізкасць вобразаў да беларускага фальклору, далейшы пошук нацыянальнай своеасаблівасці формы балетнага спектакля. Лірыка-драматычнае вырашэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэмы, асаблівасці драматургіі, яркія акцёрскія работы (А. Нікалаевай, С. Дрэчына). Прысуджэнне стваральнікам балета Дзяржаўнай прэміі.

Балет В. Залатарова – А. Ермалаева «Палымяныя сэрцы» (1955). Эксперымент у галіне ўвасаблення на балетнай сцэне сучаснай тэмы (першы варыянт балета паказаны ў 1953 г. пад назвай «Аповесць пра каханне»), удачы і пралікі пастаноўшчыка, недаацэнка ім ролі музычнай драматургіі. Зварот тэатра да жанру народна-гераічнага балета, умоўнасць і абагульненасць сцэнічных вырашэнняў, харэаграфічнай мовы. Вобразы галоўных дзеючых асоб (С. Дрэчын, Л. Ражанава, Я. Глінскіх).

Балет Я. Глебава – А. Дадзішкіліяні «Абранніца». Вобразнасць і псіхалагічная выразнасць музыкі балета. Слабасць сцэнарнай драматургіі, супярэчнасць харэаграфічнага вырашэння вобразаў галоўных дзеючых асоб.

Распрацоўка лірыка-камедыйнага жанру ў балеце Г. Вагнера – К. Мулера «Падстаўная нявеста» (1957). Удачы і пралікі аўтараў – маляўнічыя танцы, цікавыя акцёрскія работы, арганічнае ўключэнне ў харэаграфію элементаў нацыянальнага фальклору; фрагментарнасць сцэнарнай драматургіі, побытавая прыземленасць канфліктаў, выкарыстанне нетанцавальнай пантамімы.

Выканальніцкае майстэрства вядучых салістаў балетнай трупы.

*Тэма 5. Спектаклі беларускіх харэографаў на сучасную тэму*

Балет Я. Глебава – А. Андрэева «Мара» (1961). Пашырэнне кола тэм, распрацаваных у нацыянальных харэаграфічных спектаклях. Яркая меладычнасць, драматычная насычанасць музыкі балета, выкарыстанне кампазітарам нацыянальнага меласу. Глыбіня вобраза Марыі (арт. А. Карзянкова), паэтычнае вырашэнне шэрагу сцэн. Дывертысментнасць першага акта балета, бляклaсць і статычнасць вобраза моладзі. Выкарыстанне народных танцаў («Бульба», «Мяцеліца») у драматургіі балета.

Балет Я. Глебава – А. Дадзішкіліяні «Альпійская балада» (1967) – мастацка паўнаважнае ўвасабленне сучаснай тэмы. Сцвярджэнне мужнасці чалавека перад тварам смерці – асноўная тэма балета. Эмацыянальная выразнасць і псіхала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гічная глыбіня музычных і харэаграфічных вобразаў, сімфанізм структурнага вырашэння балета. Філасофская накіраванасць думкі стваральнікаў балета.

Балет У. Кандрусевіча – Ю. Траяна «Крылы памяці» (1986). Харэаграфічна абагульнены вобраз фашысцкага нашэсця, бляклсць пластычных характарыстык асноўных герояў.

*Тэма 6. Выканальніцкае майстэрства артыстаў беларускага балета*

Індывідуальныя асаблівасці трактоўкі вобразаў, створаных А. Нікалаевай, С. Дрэчыным, Н. Младзінскай, Б. Карпілавай, Т. Караваевай, Я. Глінскіх, Н. Давыдзенка, Л. Ражанавай, А. Карзянковай, І. Савельевай, К. Малышавай, В. Давыдавым, В. Міронавым і інш.

Працяг традыцый старэйшага пакалення ў творчасці маладых артыстаў. Новыя рысы выканальніцтва ў сучасных балетах. Мастацтва Л. Бржазоўскай, Ю. Траяна, В. Саркісьяна, Н. Паўлавай, У. Камкова, У. Іванова, С. Пясцехіна, Т. Яршовай і інш.

*Тэма 7. Балетмайстарская дзейнасць В. Елізар'ева*

Філасофская накіраванасць, паэтычная шматзначнасць спектакляў, пастаўленых В. Елізар'евым. Сучаснасць іх гучання. Пошукі балетмайстрам новых сродкаў выразнасці, абнаўленне харэаграфічнай мовы, арганічны сінтэз музыкі, харэаграфіі і сцэнаграфіі – вызначальная рыса спектакляў В. Елізар'ева. Садружнасць з мастаком Я. Лысікам.

Балет «Кармэн-сюіта» Бізэ – Шчадрына – Елізар'ева (1974). Трагічнасць вобраза Кармэн (Л. Бржазоўская, Н. Паўлава), выразнасць, эмацыянальная напоўненасць харэаграфічных характарыстык.

Балет А. Пятрова «Стварэнне свету» (1976). Аналіз яго вобразнай сістэмы. Маштабнасць і актуальнасць узнятых у ім пытанняў. Яркая тэатральнасць формы, арганічнае адзінства музыкі, харэаграфіі і сцэнічнага афармлення (мастак Я. Лысік). Л. Бржазоўская, Ю. Траян, В. Саркісьян – выканаўцы цэнтральных партый.

Балет Я. Глебава «Ціль Уленшпігель» (1978). Аналіз яго музычнай і харэаграфічнай драматургіі. Шматзначная абагульненасць вобразаў, спраектаванасць іх у наш час. Абнаўленне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

харэаграфічнай лексікі, узбагачэнне яе элементамі спорту, побыту. Глыбіня вобразаў Ціля і Нэле, гратэскавыя фарбы ў партыях адмоўных персанажаў. Інтэлектуалізм канцэпцыі спектакля. Метафарычнасць, мастацкая ўмоўнасць вырашэнняў.

«Спартак» А. Хачатурана (1980). Асаблівасці музычна-харэаграфічнай драматургіі. Адмаўленне ад другарадных персанажаў (Эгіны, Гармодыя). Стварэнне шматпланавага вобраза народа. Натхнёнае мастацтва Л. Бржазоўскай (Фрыгія) і Ю. Траяна (Спартак).

Аднаактавыя балеты «Карміна Бурана» К. Орфа (1983), «Балеро» М. Равеля (1984), «Вясна свяшчэнная» І. Стравінскага (1986) у пастаноўцы В. Елізар’ева. Пошук выяўленчых сродкаў, арыгінальнасць кампазіцый.

«Рамэа і Джульета» С. Пракоф’ева (1988). Стварэнне В. Елізар’евым новай харэаграфічнай версіі балета. Персаніфікацыя вобраза зла. Харэаграфічны тэматызм, развіццё пластычных матываў.

Пастаноўка В. Елізар’евым класічных балетаў «Шчаўкунок», «Лебядзінае возера», «Дон Кіхот».

Выканальніцкае майстэрства новага пакалення майстроў беларускага балета – І. Душкевіч, Н. Дадзішкіліяні, Т. Шаметавец, К. Фадзеевай, У. Захарава, А. Фурмана.

Сучаснасць творчасці В. Елізар’ева, абнаўленне выяўленчых сродкаў, сінтэз музыкі, харэаграфіі і сцэнаграфіі ў яго балетах.

Балеты «Страсці» А. Мдзівані і «Жар-птушка» І. Стравінскага. Асаблівасці драматургіі.

Новае пакаленне выканаўцаў на беларускай сцэне ў 1990–2000-я гг.

*Тэма 8. Харэаграфія на рубяжы XX–XXI стст.*

Дзяржаўны ансамбль танца Рэспублікі Беларусь (створаны ў 1959 г.). Творчыя стылі балетмайстраў А. Апанасенкі, С. Дрэчына, М. Мурашкі, У. Дудкевіча. Канцэртныя праграмы калектываў розных гадоў, рэпертуарная палітыка. Найбольш яркія пастаноўкі: «Лявоніха», «Лянок», «Бычкі», «Мяцеліца», «Вянок беларускіх танцаў», «Гапак» і інш. Прынцыпы ўвасаблення харэаграфічнага фальклору ў калектыве.

Харэаграфічны ансамбль «Харошкі» пад кіраўніцтвам В. Гаявой (створаны ў 1973 г.). Асаблівасці інтэрпрэтацыі ім

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

харэаграфічнага фальклору. Нумары, створаныя на яго аснове: «Весялуха», «Гусарыкі», «Мітусь», «Лянсей» і інш.

Змена кіраўніцтва балетнай трупай тэатра оперы і балета.

Харэаграфічныя мініяцюры выпускніка Беларускай акадэміі музыкі Раду Паклітару на сцэне Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра і «Кіеў-мадэрн-балета». Іх свежая вобразнасць, іронія як адна з дамінуючых фарбаў у палітры балетмайстра (спектаклі «Шчаўкунок», «Дождж» і інш.).

*Тэма 9. Сучасны танец*

Фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску (IFMC), прынцыпы яго дзейнасці і ўплыў на постсавецкую харэаграфію.

Гурт сучаснай харэаграфіі «Тад» Д. Куракулава ў Гродне, пошук сродкаў сучаснай выразнасці. Лепшыя пастаноўкі (балет «Нана-секунды» і інш.).

Фолк-мадэрн-тэатр «Госціца» Л. Сімаковіч.

Калектывы «D.O.Z.S.K.I.» пад кіраўніцтвам Д. Залескага. Паспяховае выкарыстанне магчымасцей мадэрн-пластыкі, лексікі contemporary dance, сінтэзу выразных сродкаў розных відаў мастацтваў.

Іншыя калектывы сучаснага танца, якія працуюць у Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Бахрушин, Ю.* История русского балета / Ю. Бахрушин. – М. : Искусство, 1977. – 287 с.

*2. Васенина, Е.* Российский современный танец. Диалоги / Е. Васенина. – М. : Emergency Exit, 2005. – 268 с.

*3. Красовская, В.* История русского балета / В. Красовская. – Л. : Искусство, 1978. – 231 с.

*4. Чепалов, О.* Хореографический театр Західна Европи XX ст. / О. Чепалов. – Харків : ХДАК, 2007. – 344 с.

*5. Чурко, Ю. М.* Белорусский балетный театр / Ю. М. Чурко. – Минск : Беларусь, 1983. – 183 с.

*6. Чурко, Ю. М.* Линия, уходящая в бесконечность / Ю. М. Чурко. – Минск : Полымя, 1999. – 222 с.

*Дадатковая*

*1.* Балет : энциклопедия / гл. ред. Ю. Григорович. – М. : Сов. энциклопедия, 1981. – 623 с.

*2. Барышев, Г.* Театральная культура Белоруссии XVIII в. / Г. Барышев. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.

*3. Бежар, М.* Мгновения в жизни другого : мемуары / М. Бежар. – М. : Союзтеатр, 1989. – 238 с.

*4. Бежар, М.* В чьей жизни…? : мемуары / М. Бежар. – М. : АО Рус. творч. палата, 1998. – 110 с.

*5. Блэйер, Ф.* Айседора / Ф. Блэйер. – Смоленск : Русич, 1994. – 368 с.

*6. Блок, Л.* Классический танец : История и современность / Л. Блок. – М. : Искусство, 1987. – 556 с.

*7. Ванслов, В.* Балеты Григоровича и проблемы хореографии / В. Ванслов. – М. : Искусство, 1971. – 304 с.

*8. Гаевский, В.* Хореографические портреты / В. Гаевский. – М. : Артист. Режиссер. Театр, 2008. – 608 с.

*9. Звездочкин, В. А.* Творчество Леонида Якобсона / В. А. Звездочкин. – СПб. : С.-Петерб. гуманитар. ун-т профсоюзов, 2007. – 220 с.

*10. Добровольская, Г. Н.* Федор Лопухов / Г. Н. Добровольская. – Л. : Искусство, 1976. – 320 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*11. Красовская, В.* Западноевропейский балетный театр. Очерки истории. Романтизм / В. Красовская. – М. : Артист. Режиссер. Театр, 1996. – 432 с.

*12. Мушинская, Т.* Валентин Елизарьев / Т. Мушинская. – Минск : Беларусь, 2003. – 192 с.

*13.* Советский балетный театр. 1917–1967 / ред. В. М. Красовская. – М. : Искусство, 1976. – 376 с.

*14. Стюарт, О.* Рудольф Нуриев / О. Стюарт. – Смоленск : Русич, 1998. – 426 с.

*15. Фокин, М.* Против течения. Воспоминания балетмейстера. Статьи. Письма / М. Фокин. – Л. ; М. : Искусство, 1962. – 638 с.

*16. Чернова, Н.* От Гельцер до Улановой / Н. Чернова. – М. : Искусство, 1979. – 240 с.

*17. Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Минск : Беларусь, 1990. – 415 с.

*18. Чурко, Ю. М.* Хореография в зеркале критики : сб. ст. / авт.-сост. Ю. М. Чурко. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры и искусств, 2010. – 356 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Ацэньванне на экзамене праводзіцца па дзесяцібальнай шкале:

**1 (адзін)** – адсутнасць ведаў у сферы харэаграфіі вывучаемага перыяду.

**2 (два)** – слабае веданне факталагічнага матэрыялу, няўменне арыентавацца ў важнейшых пытаннях.

**3 (тры)** – фрагментарныя веды ў сферы харэаграфіі, недастаткова дакладнае разуменне мастацкіх тэндэнцый вывучаемага перыяду.

**4 (чатыры)** – мінімальна дастатковы аб'ём ведаў па гісторыі развіцця харэаграфіі дадзенага этапу; уменне вылучаць асноўныя напрамкі і творы.

**5 (пяць)** – кампетэнтны адказ на кардынальныя пытанні па гісторыі развіцця і стылістыцы творчасці харэографаў.

**6 (шэсць)** – дастаткова поўнае веданне гістарычных фактаў у аб'ёме праграмы; уменне выявіць мастацкую каштоўнасць твораў асобнага балетмайстра, раскрыць індывідуальнасць выканаўцаў.

**7 (сем)** – поўнае і сістэматызаванае веданне ўсіх тэм, прадугледжаных праграмай; лагічнае выкладанне пытанняў; уменне рабіць граматны аналіз харэаграфічных спектакляў і праграм.

**8 (восем)** – поўнае, глыбокае, сістэматызаванае веданне вучэбнага матэрыялу; уменне рабіць абгрунтаваныя высновы і абагульненні, выяўляць вядучыя тэндэнцыі развіцця харэаграфічнага мастацтва.

**9 (дзевяць)** – поўнае, глыбокае, сістэматызаванае веданне вучэбнага матэрыялу; уменне яго аналітычна ацэньваць; выяўляць вядучыя тэндэнцыі развіцця харэаграфічнага мастацтва; актыўная творчая работа на розных відах групавых заняткаў.

**10 (дзесяць)** – поўнае, глыбокае, сістэматызаванае веданне матэрыялу ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай, а таксама пытанняў, якія выходзяць за яе межы; здольнасць выкарыстоўваць набытыя веды для вырашэння творчых задач; разуменне месца і ролі сучаснай харэаграфіі ў гістарычным кантэксце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі студэнтаў прадугледжаны калёквіумы і гутаркі, вуснае апытанне, даклады па асобных пытаннях, абарона курсавых работ. У якасці выніковай формы кантролю праводзяцца залікі і экзамены.

Для дыягностыкі прафесійнай кампетэнцыі і выяўлення ўзроўню навучальных дасягненняў студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступны інструментарый:

1. Комплексныя рознаўзроўневыя заданні:

– вывучэнне асобных звёнаў і частак архітэктонікі; харэаграфічных твораў;

– выяўленне тэмы, ідэі драматургіі балетаў;

– аналіз балетаў, якія ўваходзяць у праграму.

2. Вуснае апытанне студэнтаў.

3. Пісьмовы аналіз лепшых пастановак сучасных харэографаў (па выбары).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў прадугледжвае абавязковае знаёмства з дадатковымі крыніцамі, пастановачнай дзейнасцю лепшых творчых калектываў Беларусі, вывучэнне вопыту вядомых айчынных і замежных харэографаў з мэтай фарміравання ў будучых балетмайстраў мастацкага густу, пашырэння кругагляду ў сферы прафесійнага мастацтва.

Самастойная работа студэнтаў уключае таксама выкананне дамашніх заданняў, прагляд і аналіз балетаў, праграм аматарскіх калектываў Мінска, Гродна, Брэста і іншых гарадоў Рэспублікі Беларусь (па выбары студэнта), дзе ёсць ансамблі народнага танца.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Патрабаванні да курсавой работы

У адпаведнасці з вучэбным планам па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя і тэорыя харэаграфічнага мастацтва» прадугледжана напісанне курсавой работы, на якую ўсяго адведзена 20 гадзін (22–24 стандартныя старонкі друкаванага тэксту).

Мэта курсавой работы – навучыць студэнтаў самастойна і аргументавана выказваць свае думкі, звязваць тэорыю з практыкай і надзённымі праблемамі будучай прафесіі. Аўтар курсавой работы павінен асвоіць правілы яе афармлення ў адпаведнасці з усталяванымі ў сучаснай навуковай практыцы патрабаваннямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ І ТЭОРЫЯ ХАРЭАГРАФІЧНАГА МАСТАЦТВА**

*Тыпавая вучэбная праграма*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-17 02 01*
*Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках), напрамкаў спецыяльнасці*
*1-17 02 01-04 Харэаграфічнае мастацтва (народны танец);*
*1-17 02 01-05 Харэаграфічнае мастацтва (бальны танец);*
*1-17 02 01-06 Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец);*
*1-17 02 01-10 Харэаграфічнае мастацтва (сучасны танец)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 2,09. Ул.-выд. арк. 1,45. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ